# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

*М.А.БЯСПАЛАЯ*

## ЭКАНОМІКА ЦІ КУЛЬТУРА: ШТО ПЕРШАСНАЕ?

Пытанне, пастаўленае ў назве артыкула, было надзвычай папулярным у савецкі перыяд. Большасць тагачасных даследчыкаў не сумняваліся ў прыярытэце эканомікі. На гэтым пастулаце будавалася сістэма ўсёй марксісцка-ленінскай навукі – ад гісторыі партыі да навуковага камунізму і палітычнай эканоміі. Тэарэтычнае ўвасабленне палажэння аб першаснай ролі эканомікі знайшло адбітак у тэорыі фармацый, асабліва ў фармацыйным падыходзе да вывучэння ўсіх кірункаў развіцця грамадства.

Сучасны стан навукі, перамены ў сацыяльна-культурным жыцці дазваляюць ставіць і аналізаваць пытанне аб цеснай узаемазалежнасці, узаемадзеянні і ўзаемаўплыве эканомікі і культуры.

Нават на ўзроўні міжасобасных кантактаў відаць своеасаблівае дыялектычнае адзінства эканомікі і культуры, бо мала што так нервуе кожнага чалавека, як адсутнасць грошай у сябе і адсутнасць культуры ў другога. У пэўным сэнсе мы можам гаварыць аб праяўленні ў гэтай псіхалагічнай сітуацыі прымет адзінства і барацьбы супрацьлегласцей і ўзаемазалежнасці эканомікі і культуры. Нават ў такім прыватным выпадку нельга сцвярджаць аб першаснасці эканомікі ці культуры.

Арыгінальную думку па азначаным пытанні выказаў сусветна вядомы французскі вучоны, прадстаўнік школы “Аналаў”, даследчык гісторыі эканамічнага развіцця еўрапейскай цывілізацыі Ф.Брадэль. Аўтар тэорыі аб эканамічнай арганізацыі пэўнай прасторы, якую ён назваў “Мір – эканоміка”, даволі аргументавана сцвярджаў, што “кожны мір – эканоміка” імкнуўся мець адну і тую ж культуру ці хаця б асобныя яе элементы. Аднак поўнага супа- дзення ніколі нельга было дасягнуць, таму што культура вядзе сваё паходжанне з бясконцага мінулага, якое пераўзыходзіла, і намнога, саму па сабе ўразлівую даўгавечнасць “міра – эканомікі”. Яна – самы старажытны персанаж гісторыі чалавецтва: адна эканоміка змяняла другую, рушыліся палітычныя інстытуты, грамадствы змянялі адно другое, а цывілізацыя (культура) працягвала свой шлях [1, с. 60]. Такім чынам, паводле слоў Ф.Брадэля, культура можа разглядацца як першапачатковая ўмова сацыякультурнага развіцця чалавецтва. На працягу тысячагоддзяў яна паўстае як сума мноства багаццяў – матэрыяльных і духоўных.

У апошнія дзесяцігоддзі з’явіліся навуковыя даследаванні, прысвечаныя праблеме зараджэння духоўнай культуры. Калі аб мастацкай ці матэрыяльнай культуры можна гаварыць больш-менш дакладна, карыстаючыся здабыткамі археалогіі, палеалогіі і іншых навук, а таксама дастаткова шматлікімі помнікамі старажытнай культуры, што з'явіліся паміж 40–30 гг. да н. э., то адзначаная вышэй праблема выклікала цікавыя навуковыя дыскусіі.

У канцы XX ст. пачала распаўсюджвацца тэорыя аб першабытных мона-нормах – такіх правілах паводзін, якія “аб’ядноўваюць асаблівасці разнастайных нормаў паводзін і якія, аднак, не могуць быць аднесены ні да сферы права, ні да сферы маралі з яе рэлігійным усведамленнем, ні да сферы этыкету”… [3, с. 98] Калі сярод навукоўцаў фактычна не існавала разыходжанняў у пытанні эвалюцыі гэтага класічнага этапу першабытнай монанарматыкі, то праблема яе расслаення, выдзялення на яе аснове такіх культурных з’яў, як мараль і права, выклікала навуковыя спрэчкі, таму што пазіцыі вучоных прыметна адрозніваліся. У асноўным іх можна звесці да таго, што на этапе вытворчай эканомікі дзейнічаюць сярод іншых і такія рэгулятары, як міфарэлігійны, прававы і маральны, аднак апошні яшчэ не выдзяляецца з першага. Аб вытворчай эканоміцы мы можам гаварыць як аб выніку неалітычнай рэвалюцыі, якая пачалася ў Пярэдняй і Малой Азіі прыкладна ў VIII–VII тыс. да н.э. Такім чынам, зробім выснову аб з’яўленні ў гэты гістарычны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыяд рэгулятараў сацыякультурнага і эканамічнага развіцця, якія звязаны з маральна-этычнымі ўяўленнямі тагачаснага грамадства.

Можна поўнасцю пагадзіцца з заключэннем, што ў сэрцы кожнай культуры замацоўваюцца рэлігійныя каштоўнасці. Нельга не прывесці выказванне вядомага амерыканскага паэта Т.С.Эліёта: "Асноўным у стварэнні агульнай культуры народаў, кожны з якіх мае сваю культуру, з'яўляецца рэлігія… Маюцца на ўвазе агульная хрысціянская традыцыя, якая стварыла Еўропу такой, якой яна ёсць, і агульныя элементы культуры, якія прынесла з сабою хрысціянства" [4, с. 7]. Рэлігійнае жыццё цесна пераплятаецца з эканомікай. Прычым кожны этап гістарычнага развіцця характарызуецца пэўнай формай такой узаемасувязі. Нагадаем прыклады з гісторыі старажытных гарадоў-дзяржаў Месапатаміі, цэнтрам эканамічнага і культурнага жыцця якіх з'яўляліся храмы мясцовых багоў, дзе сфарміравалася адна з вяршынь чалавечага  генія – пісьменства. Яно выклікала жаданне зафіксаваць матэрыяльныя здабыткі пэўнай людской супольнасці. Выразным сведчаннем адметнай узаемазалежнасці эканомікі і культуры з'яўляецца развіццё Старажытнай Грэцыі, у якой кожны поліс шанаваў сваё бажаство, хаця пантэон багоў быў адзіным для ўсіх грэкаў, і кожны поліс развіваў сваю эканоміку, аднак у грэчаскіх калоніях выхадцы з полісаў супрацоўнічалі на карысць адзінай Грэцыі.

Досыць своеасаблівыя стасункі паміж эканамічным і рэлігійным жыццём былі ў сярэднявеччы. Амаль тысячагоддзе царква, якая выконвала ролю культурнага асяродка, усімі сіламі змагалася з увядзеннем грошай. Для яе гэта было вельмі важна, таму што "яна прадстаўляла даўно мінулую эпоху, куды больш даўнюю, чым капіталізм" [5, с. 60]. Нават такая субстанцыя развіцця грамадства, як час, трактавалася царквою як данасць Бога, а не чалавека. Мэтанакіравана асуджалася ліхвярства, таму што ліхвяр атрымоўваў даход не ад вынікаў працы, а толькі «дзякуючы часу, бо нават калі ён спіць, яго "валы", гэта значыць грошы, прадаўжаюць "араць" – прыносіць яму несправядлівы прыбытак» [5, с. 360]. Гэтым самым клір спрабаваў кантраляваць вытворчае і асабістае жыццё веруючых. Аднак уздым гандлю, прамысловасці, гарадоў выклікаў да жыцця новую сілу – прадпрымальнікаў і купцоў, якія кардынальна пераасэнсоўвалі існуючы ўклад жыцця і ролю царквы ў яго арганізацыі. Знешне гэта праявілася ў многіх фактах, напрыклад у такім: калі раней час вызначалі па гуках царкоўных званоў, то ў XIII–XIV стст. на гарадскіх ратушах устанаўліваюцца гадзіннікі. На змену "часу царквы" прыйшоў  "час купца".

У канцы сярэднявечча наспелі радыкальныя перамены як у культуры, так і эканоміцы. На памежжы XIV –XV стст. назіраецца  так званы "крызіс веры", галоўным зместам якога стаў паварот да адзінокай душы, да самапаглыбленай малітвы, уяўленне аб магчымасці прамой сувязі адзінокай душы з Богам. Пачынае адасабляцца індывід, ён кіруецца асабістым інтарэсам як у творчасці, так і ў прадпрымальніцтве. Купец адчувае сябе чалавекам, які сам прабівае сабе дарогу да багацця любымі сродкамі, і не ў апошнюю чаргу выкарыстоўваючы навуковыя дасягненні. Напрыклад, вынаходніцтва І.Гутэнберга садзейнічала развіццю кніжнай культуры, пашырэнню колькасці адукаваных людзей і ў выніку – актывізацыі эканамічнага развіцця. Багатыя сем'і – Фугеры, Медзічы, Строцці і іншыя — выступаюць як актыўныя мецэнаты, прычым яны імкнуцца, каб іх выявы былі размешчаны на мастацкіх творах, дэман-          струючы гэтым самым сваё жаданне застацца ў гісторыі, дзякуючы эканамічнай падтрымцы культуры.

Своеасаблівым адмоўным адлюстраваннем сімбіёзу культуры і эканомікі з далёка ідучымі вынікамі можна лічыць такую з'яву, як індульгенцыі, калі за грошы куплялася адпушчэнне грахоў, нават наперад. Сродкі ад продажу індульгенцый адпраўляліся ў Рым, дзе яны ў пэўнай ступені стваралі матэрыяльную аснову італьянскага Адраджэння. Другі бок увядзення практыкі індульгенцый – Рэфармацыя, якая адлюстравала незадавальненне эканамічна арыентаваных сацыяльных груп рэлігійнымі абмежаваннямі сваёй дзейнасці і падзенне аўтарытэту царквы. Дадзеная сітуацыя садзейнічала пашырэнню розных формаў пратэстантызму. Як вядома, галоўным стрыжнем ідэалогіі гэтай плыні сталі ўяўленні аб прадвызначэнні чалавека і наданне вышэйшага сэнсу эканамічнай дзейнасці. Можна сказаць, што ўпершыню ў гісторыі сярэднявечча пратэстантызм прывёў эканамічную практыку і культурныя погляды ў пэўную гармонію.

Пачатак Адраджэння звязаны перш за ўсё з эканамічным уздымам італьянскіх гарадоў, у першую чаргу з найбольш развітым з іх – Фларэнцыяй. Кіруючай вярхушцы паўночна-італьянскіх гарадоў для ўмацавання сваёй эканамічнай ролі патрэбны былі веды аб навакольным свеце. З аднаго боку, дух прадпрымальніцтва, вера ў магчымасці чалавека, з другога – ужыванне компаса, удасканаленых марскіх карт, будаўніцтва караблёў значнага водазмяшчэння выклікалі не толькі вялікія геаграфічныя адкрыцці, але і змены ў вектары еўрапейскага гандлю, а разам з гэтым і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перамяшчэнне культурных цэнтраў. У канцы XII ст. у эканамічна развітых італьянскіх гарадах узнікаюць асноўныя аб'екты аб'яднання еўрапейскай культуры – універсітэты ў Балоны, Салерна, пазней яны з'яўляюцца на поўначы Еўропы – Парыжы, Оксфардзе, Кембрыджы. З канца XIV ст. цэнтрам культурнага ўздыму, які суправаджаецца і эканамічным уздымам, становіцца Бургундыя, аднак гэты працэс недаўгавечны, ён хутка перамяшчаецца на поўнач Еўропы.

Нельга абысці ўвагай і геаграфічны фактар, што аказваў уплыў на рэгіянальныя асаблівасці эканамічнага і культурнага развіцця. Гісторыя чалавецтва ведае факты масавых кантактаў у эканоміцы і культуры ў межах розных цывілізацый. Можна сказаць, што ўсё пачалося з асваення чалавекам айкумены, найбольш маштабнай праявай чаго сталі хвалі Вялікага перасялення народаў. У свой час значную ролю ў эканамічных і культурных кантактах Захаду і Усходу адыгралі Вялікі шаўковы шлях, а затым крыжовыя паходы.

Паўднёвая і Паўночная Еўропа таксама дэманструе розны культурны і эканамічны ўзровень, прычым нельга адмаўляць вялікі ўплыў пратэстанцкай этыкі на паглыбленне гэтага адрознення. Нават на эмацыянальным ўзроўні мы з цяжкасцю ўяўляем магчымасць такога сюжэта ў творах італьянскіх мастакоў, як, напрыклад, на карціне К.Масейса “Мянала з жонкаю” ці на карціне Р.Вале “Дробны банкір з жонкаю”. Адзін з вядучых сучасных гісторыкаў Норман Дэвіс вызначае як галоўную ролю пратэстантызму ў стварэнні новага цэнтра культуры ў краінах Паўночна-Заходняй Еўропы і ў эканамічным уздыме гэтага рэгіёна [4, с. 17].

Многія гістарычныя факты сведчаць аб фарміраванні на працягу стагод- дзяў заходнееўрапейскага і ўсходнееўрапейскага арэалаў эканамічнага і культурнага адзінства. Межы паміж імі прапануюцца самыя разнастайныя як па храналогіі, так і па прынцыпе, які пакладзены ў падмурак такога падзелу. Самая старажытная – гэта мяжа рымскіх умацаваных лагераў, так званых “limes”, якія супадаюць з прыроднымі межамі па Рэйне і Дунаю. У часы Рымскай імперыі гэтая мяжа вызначыла яе тэрытарыяльныя дасягненні і магчымасці эканамічнага і культуранага ўплыву, які, у сваю чаргу, абумовіў свое- асаблівасці эканамічных і культурных працэсаў Заходняй Еўропы. Відавочна, што падзенне эканамічнага і палітычнага значэння Рыма кампенсавалася ўзрастаннем яго ролі ў духоўным жыцці сярэднявечнага Захаду, таму што ў пачатку гэтага перыяду ён ператвараецца ў цэнтр хрысціянскай культуры.

Арэал распраўсюджання раманскага і гатычнага архітэктурных стыляў таксама пацвярджаюць існаванне заходнееўрапейскага культурнага і эканамічнага адзінства. На падставе шматлікіх фактаў Ф.Брадэль адлюстроўвае ажыццяўленне фінансавых аперацый толькі ў межах Заходняй Еўропы нават у XVIII ст. і даказвае, што справа заключалася “не толькі ў тэхнічнай прычыне, а хутчэй за ўсё ў культурнай, таму што за межамі Захаду таксама адбываліся аналагічныя працэсы…” [1, с. 61–62].

Нельга забываць яшчэ аб адным размежаванні Еўропы, маецца на ўвазе падзел на каталіцкі Захад і праваслаўны Усход. У выніку гэтага падзелу ні адзін з інавацыйных рухаў на каталіцкім Захадзе (Рэнесанс, Рэфармацыя, навуковая рэвалюцыя і Асветніцтва) не аказаў вырашальнага ўплыву на права- слаўе, аб чым пераканаўча сведчыць гісторыя.

Для станаўлення ўсходнееўрапейскай цывілізацыі вызначальным можна лічыць прыклад Візантыі. Асаблівасці ў развіцці гэтай цывілізацыі аказаліся ў многім вырашальнымі для лёсу ўсходніх славян на працягу эвалюцыі іх эканамічнага, грамадскага і культурнага жыцця. І галоўнае не толькі ў прыняцці імі хрысціянства ад Візантыі, але і ў многіх іншых з'явах. Своеасаблівы, цікавы і грунтоўны погляд на ўзаемаўплыў эканомікі і культуры Візантыі выказаў французскі гісторык Андрэ Гійу. Яго высновы заключаюцца ў тым, што “візантыйская культура старанна захоўвала каштоўнасці былога і насцярожана ставілася да сучаснага. Візантыйцы імкнуліся захаваць недатыкальнымі свае традыцыі, якія грунтаваліся на аднароднасці, на яднанні свецкага і рэлігійнага жыцця. Менавіта гэтым можна растлумачыць адсутнасць вынаходніцтва і ўдасканалення сродкаў вытворчасці” [2, с. 393]. Такім чынам, на думку вучонага, адсутнасць навацый у культуры, арыентацыя на традыцыі прадвызначылі паступовую стагнацыю візантыйскага грамадства. Нельга не заўважаць, што галоўны пастулат візантыйскага грамадства, сфарміраваны праваслаўнай царквой, – “набожнасць вышэй за багацце” – аказаў і аказвае свой уплыў на ўсходнеславянскія народы.

Вышэйадзначаныя асаблівасці праявіліся ў развіцці культуры ўсходніх славян, на фундаменце якой фарміравалася адпаведная эканоміка, цесна звязаная з эканомікай Візантыі і пераняўшая яе эканамічны вопыт. Полацкі перыяд гісторыі дазваляе вызначыць агульныя з візантыйскімі рысы эканамічнага і культурнага развіцця. Можна думаць, што пэўная насцярожнасць да навацый

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадвызначыла галоўную дамінанту ўлады ў Вялікім княстве Літоўскім, агучаную вялікім князем Гедымінам: “Старыны не рушыць і навіны не ўводзіць”. Безумоўна, такая пазіцыя была характэрна для палітычнай арыентацыі, аднак і эканоміка, і культура не маглі не адчуваць яе ўплыў.

Падаецца, што не апошнюю ролю гэтая акалічнасць адыграла ў фарміраванні такога феномена культуры сярэдневяковага грамадства ВКЛ, як “залатыя шляхецкія вольнасці” са сваёй сістэмай каштоўнасцей, у якой, на жаль, не знайшлося месца разуменню важнасці эканамічнай дзейнасці. Свое- асаблівым адлюстраваннем гэтага стала адсутнасць эканамічнага прагрэсу на працягу стагоддзяў. Спробы рэформаў у асноўнай галіне вытворчасці прывялі да павелічэння паншчыны і выкарыстання вынікаў такога пазаэканамічнага падыходу толькі ў асабістых мэтах, у асноўным у тратах на прадметы раскошы. Адзінкавыя зрухі прадпрымальніцкага характару ў XVIII ст. таксама прадугледжвалі выпуск прадметаў для асабістага ўжытку найбольш багатых сем’яў. Такім чынам, можам адзначыць наяўнасць відавочнай узаемазалежнасці паміж культурным і эканамічным станам Рэчы Паспалітай і паставіць пытанне аб тым, ці не стала гэта адной з прычын яе падзення.

Працэс станаўлення кожнай нацыі, асабліва беларускай, таксама адлюстроўвае неабходнасць адзінства эканомікі і культуры. Агульнавядома, наколькі складаны шлях прайшоў беларускі этнас, які фарміраваўся без удзелу найбольш актыўных і адукаваных носьбітаў культуры і без ініцыятыўных, эканамічна моцных і зацікаўленых у падтрымцы менавіта тытульнага этнасу прадпрымальніцкіх колаў.

Надзвычай тонка і выразна прааналізаваў у канцы 70 – пачатку 80-х гг. XIX ст. зараджэнне ідэі беларускай самабытнасці, адметнасці беларускай культуры А.Цвікевіч. Ён падкрэсліваў, што “беларускае адраджэнне як кожнае сацыяльнае з’явішча не магло быць вынікам голай ідэі, не абапёртай і не звязанай з тымі эканамічнымі прычынамі, якія яго выклікалі… Вось чаму ідэя беларускага культурнага адраджэння лунала ў паветры на працягу ўсяго XIX ст. і, аднак, не набыла рэальнай формы: для гэтага не было адпаведных матэрыяльных умоў” [6, с. 188].

І толькі на пераломе стагоддзяў, калі эканамічная сіла польскага капіталу аслабела, а расійскі капітал яшчэ не паспеў замацавацца ў Беларусі, паўстала “старое, спрадвечнае пытанне: што значыць “тутэйшы край” і “тутэйшы народ” [6, с. 187]. Менавіта ў гэты час можна назіраць збліжэнне эканамічных і культурных намаганняў найбольш актыўных колаў беларускага краю і першыя прыметы станаўлення нацыі.

Аб цеснай узаемазалежнасці эканамічнага і культурнага развіцця яскрава сведчыць перыяд XIX ст. Поспех прамысловай рэвалюцыі XIX ст. навукоўцы звязваюць з рэформамі ў сістэме адукацыі, якія ахапілі многія еўрапейскія краіны ў названы перыяд. Гэтай з’яве былі прысвечаны шматлікія публікацыі, і адзін з аўтараў, А.Мэдзісан, у даследаванні “Дынамічныя сілы капіталістычнага развіцця” даказаў, што чым вышэй доля адукаваных людзей ад колькасці насельніцтва, тым вышэй тэмпы эканамічнага развіцця.

Выразным прыкладам цеснай узаемасувязі паміж эканамічнымі і культурнымі мэтамі з’яўляецца ў гісторыі савецкае грамадства. Не шмат такіх момантаў яднання было ў гісторыі, можа, нешта падобнае назіралася толькі ў пратэстанцкіх краінах на першапачатковым этапе іх развіцця. Эканамічныя праекты былі разлічаны на патрыятычны і культурны водгук грамадства, іх выкананне суправаджалася відавочным культурным уздымам, аб чым сведчаць творы літаратуры, музычнага, тэатральнага, кінамастацтва. Многія з іх сталі класікай нават сусветнай культуры, а асаблівасці развіцця савецкага грамадства знайшлі сваё ўвасабленне ў спалучэнні выразаў “савецкая эканоміка” і “савецкая культура”.

Безумоўна, думкі аб выключным значэнні культуры для развіцця кожнай цывілізацыі і нават яе першаснай ролі ў гэтым працэсе маюць поўнае права на існаванне. Аднак, ці не з’яўляецца прызнанне гэтай ідэі новым перакосам, пост-марксісцкім? Як вядома, у крайнасцях жыцця няма, ісціна заўсёды пасярэдзіне. Таму, на наш погляд, эфектыўнае развіццё кожнага грамадства адбываецца пры наяўнасці гарманічнай узаемасувязі, узаемаўплыву і ўзаема-залежнасці паміж культурай і эканомікай ці паміж эканомікай і культурай.


*1. Бродель Ф.* Время мира. Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. – М.: Прогресс, 1992. – Т. 3. – 679 с.

*2. Гийу А.* Византийская цивилизация. – Екатеренбург: У – Фактория, 2005. – 552 с.

*3. Думанов Х.М., Першиц А.И.* Мононорматика и начальное право (статья первая) // Государство и право. – 2000. – № 1. – С. 98–103.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4. Дэвис Н.* История Европы / *Н.Дэвис*; Пер. с англ. Т.Б.Менской. – М.: ООО «Изд-во Аст»; ООО «Транзиткнига», 2004. – 943 с.

*5. Гофф Ж. ле* Цивилизация средневекового Запада. – М.: Прогресс-Академия, 1992. – 376 с.

*6. Цьвікевіч А.* Западно-руссизм: Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX – пач. XX в. – 2-е выд. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ